**Семінар: “Інстытуты і палітыка”**

***Уводзіны.*** Даследаванне палітыкі гэта, галоўным чынам, – даследаванне інстытутаў. Вядомы тэзіс не губляе сваёй актуальнасці і інстытуцыйнае вывучэнне палітычнага жыцця  застаецца ўплывовым накірункам сучаснай палітычнай навукі. Тым не менш, гэта не здымае праблему глыбіні разумення і практычнага прымянення падыходу. Для вырашэння гэтых задач і арганізаваны семінар, а для таго, каб задача была больш выканальная, разгляд абмяжоўваецца *гістарычным інстытуцыяналізмам*, як адным з найбольш эфектыўных падыходаў пры даследаванні і сучнасай палітыкі і палітычнай гісторыі.

***Прадмет.*** Семінар прадугледжвае падрабязны аналітычны разгляд значных і ўплывовых тэкстаў, якія цалкам змянілі разуменне палітыкі і міжнародных адносін у сучасных сацыяльных і гуманітарных навуках. *У прыватнасці працы: Паўля Піерсана (Палітыка ў часе), Кэтрын Тэлен (Як эвалюцыянуюць інстытуты?), Самуэля Гантынгтана (Палітычныя парадак у зменлівых грамадствах), Барынгтана Мура (Сацыяльныя прычыны дыктатуры і дэмакратыі), Пэры Андэрсана (Радавод абсалютысцкай дзяржавы), Тэды Скокпал (Дзяржавы і сацыяльныя рэвалюцыі), Чарльза Тылі (Прымус, капітал і еўрапейскія дзяржавы, 990-1992) і іншыя.*

***Кампетэнцыі.*** Мяркуецца, што праца ў межах семінара дазволіць удзельнікам значна паглыбіць свае разуменне палітыкі і палітычнай гісторыі, а таксама засвоіць метады і даследчыя схемы аналізу як палітычная гісторыі, так і сучасных палітычных і сацыяльных працэсаў.

***Удзельнікі***. Да ўдзелу запрашаюцца: студэнты старэйшых курсаў, магістранты, дактаранты, выкладчыкі сацыяльных і гуманітарных ды іншыя зацікаўленыя

***Дысцыпліны.*** Семінар разлічан на палітолагаў, гісторыкаў, сацыёлагаў, філосафаў і прадстаўнікоў іншых дысцыплін, якія закранаюць даследаванне палітыкі.

**Мадэратар семінара:** Андрэй Казакевіч – доктар палітычных навук (PhD in Political Science), галоўны рэдактар часопіса “Палітычная сфера”, судырэктар Беларускага калегіюму.

**Умовы паступлення:**

1. Запоўненая анкета.
2. Матывацыйны ліст.

Для аплікантаў семінара па палітычнай тэорыі сумоўе не прадугледжанае.

**Плян набора –** да 10 чалавек.